В. А. ФЯДОСІК, д. г. н., прафесар БДУ,
К. А. РЭВЯКА, прафесар БДУ,
В. У. НІЧЫПАРОВІЧ, ст. выкл. БДУ

ІОСІФ ФЛАВІЙ І ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАЯ ХРЫСЦІЯНСКАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Гісторыя рэдка дае такі незвычайны лёс чалавеку і яго справам, які яна дала Іосіфу Флавію і яго творчай спадчыне.

Незвычайна, нават парадаксальна, склаўся лёс гэтага чалавека. Сапраўднае імя яго — Йосеф бэн Маціцьяху. Ён яўрэй, нарадзіўся ў апошні год праўлення рымскага імператара Гая Калігулы, г. зн. у канцы 37 альбо на пачатку 38 г. н. э., у Іерусаліме. Паходзіў ён са знатнай яўрэйскай сям'і. Як сцвярджаў сам Іосіф, яго прадзед Сімон быў іерусалімскім першасвяшчэннікам, а радаслоўе маці ўзыходзіла да былога царскага ў Іудзеі роду Хасманеяў. У 23 гады Іосіф адправіўся ў Рым, дзе прабыў некалькі гадоў. Веліч і прыгажосць вялікага горада ўзрушылі яго. Калі Іосіф вярнуўся на радзіму, там ужо ішла вызваленчая вайна супраць рымскага прыгнёту. У гэтай вайне 66–73 гг., якую ад Іосіфа пачалі называць «Іудзейскай вайной», перапляліся як яўрэйскі нацыянальна-вызваленчы рух супраць рымлян, якія з 6 г. н.э. зрабілі Іудзею сваёй правінцыяй, так і сацыяльная, рэлігійная барацьба ўнутры самога іудзейскага грамадства. Йосеф бэн Маціцьяху быў назначаны камандуючым войскамі паўстанцаў у Галілеі, праз якую рымляне нанеслі галоўны ўдар. Іосіф дзейнічаў марудна, нерашуча, а калі рымляне разбілі паўстанцаў у Галілеі, ён здаўся ў палон. У палоне ён прадказаў рымскаму палкаводцу Веспасіяну, што той хутка стане імператарам. Так і адбылося. Веспасіян вызваліў Іосіфа з палону, і той у знак падзякі ўзяў сабе радавое імя Веспасіяна — Флавій. Так Йосеф бэн Маціцьяху стаў Іосіфам Флавіем. Ён стаў на шлях здрады, служыў спачатку пры Веспасіяне, а потым ад'ютантам пры яго сыне Ціце, які давяршаў падаўленне паўстання ў Іудзеі.

Пасля падаўлення Іудзейскай вайны Іосіф пражыў астатняе жыццё ў Рыме. Ён жыў у палацы імператара на Эсквіліне, і быў па сутнасці самым уплывовым чалавекам сярод іудзеяў Рыма, карыстаўся заступніцтвам імператараў Веспасіяна, Ціта і нават Даміцыяна. У Рыме ён

заняўся літаратурнай справай, пачаў пісаць гістарычныя творы. Найбольш значныя з іх «Іудзейская вайна» (скончана ў 79 годзе) і «Іудзейскія старажытнасці» (скончаныя ў сярэдзіне 90-х гадоў) [1].

Асноўны змест у «Іудзейскай вайне» — гэта апісанне падзей 66–73 гадоў, антырымскага паўстання ў Іудзеі. Але амаль трэцюю частку гэтага свайго твору Іосіф прысвяціў апісанню папярэдняй гісторыі Іудзеі са 170-х гадоў да н. э. Гісторыя Іудзеі ў Іосіфа Флавія звязваецца альбо сінхранізуецца з гісторыяй эліністычных дзяржаў Пталямеяў і Селеўкідаў, якія вялі паміж сабою барацьбу за Іудзею, а затым з гісторыяй Рымскай дзяржавы. Змест «Іудзейскай вайны» ахоплівае такім чынам часы праўлення ў Іудзеі дынастыі Хасманеяў (ад Іуды Макавея да Антыгона), Ірада Вялікага і яго нашчадкаў, першыя дзесяцігоддзі існавання Іудзеі як рымскай правінцыі. У апісанні самой Іудзейскай вайны Іосіф не застаўся непрадузятым — даволі яскрава праглядваецца яго жаданне апраўдаць сваю здраду. Там ён пастаянна падкрэслівае бяссэнсавасць супраціўлення маленькай Іудзеі магутнаму Рыму. Але здрадзіўшы палітычна, Іосіф усё сваё жыццё заставаўся прававерным іудзеям, быў прыхільнікам фарысеяў, і паражэнне паўстанцаў ён імкнецца растлумачыць таксама і тым, што тыя парушалі прадпісанні іудзейскай рэлігіі, блюзнерскі адносіліся да іудзейскіх святыняў, у прыватнасці да Іерусалімскага храму. Жаданне апраўдаць свае паводзіны праглядваецца і ў аўтабіяграфічным «Жыцці» Іосіфа Флавія.

Іншым імкненнем кіраваўся Іосіф Флавій, ствараючы такія свае творы, як «Іудзейскія старажытнасці» і «Супраць Апіёна». Галоўная мэта, якую ставіў перад сабою аўтар «Іудзейскіх старажытнасцей» — не проста стварыць гісторыю іудзейскага народа ад яе пачатку і да часоў Іудзейскай вайны, а пазнаёміць з багатай і старажытнай гісторыяй яго народа шырокія колы чытачоў з розных народаў, якіх падпарадкаваў сабе магутны Рым. «Іудзейскія старажытнасці» складаюцца з 20 кніг. У першых адзінаццаці кнігах выкладаецца гісторыя яўрэяў ад самай старажытнасці (а пачынае сваю працу Іосіф Флавій ад стварэння Богам свету) да часоў Аляксандра Македонскага. З дванаццатай кнігі змест «Іудзейскіх старажытнасцей» пераклікаецца са зместам «Іудзейскай вайны». Да часоў паўстання Макавеяў галоўнай крыніцай Іосіфа былі біблейскія кнігі (апошняй з іх была першая Макавейская кніга), за выключэннем эліністычнага часу, які амаль не адлюстраваны ў Бібліі, і яго апісанне Іосіфам Флавіем з'яўляецца ўнікальным. У адпаведнасці з галоўнай

мэтай свайго твору Іосіф напісаў яго на грэчаскай мове, і біблейскія тэксты выкарыстоўваў па Септуагінце. Ён не пераказвае падрабязна і строга змест Бібліі, яго апавяданне больш кароткае і, калі можна так сказаць, больш гістарычнае — ён скрупулёзна прасочвае менавіта лінію чалавечай гісторыі ў Бібліі. Падзеі 170-х гг. да н. э. — першай паловы 60-х гадоў н. э., якія выкладзены і ў першых дзвюх кнігах «Іудзейскай вайны», пададзены ў «Іудзейскіх старажытнасцях» больш падрабязна, больш шырока, бывае, што і ў іншай версіі. Як і ў першай сваёй кнізе Іосіф Флавій падае гісторыю яўрэйскага народу на шырокім фоне сусветнай гісторыі (вядома, у тым выглядзе, якой яна была вядома яму).

Такім чынам, Іосіф Флавій з'яўляецца буйнейшым з яўрэйскіх гісторыкаў часоў антычнасці.

Незвычайна склаўся лёс яго творчай спадчыны. Незвычайна, перш за ўсё, у тым сэнсе, што творы іудзея-фарысея зберагла для нас хрысціянская традыцыя. У першую чаргу гэта датычыцца самай папулярнай у сярэднявеччы кнігі Іосіфа Флавія «Іудзейская вайна», а таксама «Іудзейскіх старажытнасцей». Чаму так адбылосяў Што цікавага і карыснага для сябе знаходзілі хрысціяне ў гэтых кнігахў

Перш за ўсё, у «Іудзейскіх старажытнасцях» знаходзіцца першае з вядомых нам нехрысціянскіх сведчанняў аб Ісусе Хрысце. Гэта знакамітае месца з трэцяй главы васемнаццатай кнігі, у якім распавядаецца аб тым, што ў часы пракуратара Пілата жыў мудры чалавек Ісус, які быў Хрыстом; ён быў распяты Пілатам па патрабаванню ўплывовых іудзеяў, але ўваскрэс. У даследчыкаў (як атэістаў, так і часткі тэолагаў) гэтае месца доўга лічылася больш позняй хрысціянскай інтэрпаляцыяй, тым больш, што такі буйны аўтарытэт у патрыстыцы як Арыген яшчэ ў першай палове III ст. сцвярджаў, што Іосіф Флавій не прызнаваў Ісуса Хрыстом. Сапраўды, немагчыма паверыць, каб фарысей Іосіф лічыў менавіта Ісуса Хрыстом (месіяй), ды яшчэ і верыў у яго ўваскрэсенне. Але ж сінайская знаходка на пачатку нашага стагоддзя дала іншую (невядомую да гэтага) версію адпаведнага тэксту Іосіфа Флавія. І ўсё стала на свае месцы. Іосіф, на самой справе перадае словы вучняў Ісуса аб сваім настаўніку, якога яны (а не сам Іосіф) лічылі месіяй (Хрыстом). У дваццатай кнізе Іосіф паведамляе аб пакаранні смерцю па прыгавору сінедрыёна Іакава, брата Ісуса. У 5-й главе зноў васемнаццатай кнігі апавядаецца аб праведным чалавеку Іаану, які заклікаў іудзеяў быць дабрадзейнымі і рабіць амавенні для збаўлення ад розных

грахоў. Версія яго смерці ў Іосіфа іншая, чым у Новым запавеце — ён быў пакараны смерцю тэтрархам Ірадам Анціпай з-за боязі ўзнікнення масавых хваляванняў сярод насельніцтва Іудзеі.

Ва «Іудзейскай вайне» і «Іудзейскіх старажытнасцях» хрысціяне знаходзілі даволі падрабязныя характарыстыкі шэрагу персанажаў, якія сустракаюцца ў новазапаветным каноне, але абрысаваны там вельмі фрагментарна. Гэта Ірад I (Вялікі), Ірад-Агрыпа, Ірад-Філіп, Ірадыяда, рымскія пракуратары Іудзеі Понцій Пілат, Фелікс, Порцый Фест, намеснік Сірыі П. Сульпіцый Квірыній. У сярэднявеччы творы Іосіфа Флавія былі, бадай што, адінай крыніцай, з якой можна было атрымаць звесткі аб дзеяннях гэтых людзей, з якімі перасякаліся лёсы галоўных герояў хрысціянскага Новага Запавету.

Наогул, творы Іосіфа Флавія давалі хрысціянскай думцы багаты і ўнікальны матэрыял аб той сітуацыі ў Палесціне, ды і іншых рэгіёнах Рымскай імперыі, у якой жылі і дзейнічалі Ісус, апосталы. Іудзея — радзіма хрысціянства, і гэта несумненна, выклікала ў хрысціян цікавасць да яе гісторыі, асабліва новазаветнага часу.

Але, вось што цікава. Найбольш значны матэрыял па гісторыі першапачатковага хрысціянства змешчаны ў «Іудзейскіх старажытнасцях». У «Іудзейскай вайне, дарэчы, Ісус нідзе не ўпамінаецца. А лёсы гэтых двух твораў Іосіфа Флавія ў познеантычнай і асабліва сярэдневяковай хрысціянскай традыцыі істотна адрозніваюцца. «Іудзейская вайна» зрабілася надзвычай папулярнай, а «Іудзейскія старажытнасці» выклікалі значна меншы інтарэс, асабліва гэта характэрна якраз для ўсходнеславянскай хрысціянскай традыцыі. Трэба меркаваць, што сваю ролю тут адыгралі стылістычныя і жанравыя асаблівасці гэтых твораў. «Іудзейская вайна» па стылю больш захапляльная, мова яе больш эмацыянальная, жывая. Да таго ж у сярэднявеччы існавала асаблівая цікавасць да, так бы мовіць, ваеннай гісторыі, да буйных ваенных падзей у чалавечай гісторыі (папулярнымі былі, напрыклад, у сярэдневяковай Беларусі творы аб Троі, аб Аляксандры Македонскім і г. д.). «Іудзейская вайна» ішла ў лініі менавіта такога роду твораў. Што ж датычыцца звестак аб Ісусе, якія падаюцца ў «Іудзейскіх старажытнасцях», то сярэдневяковыя перапісчыкі знаходзілі даволі простае выйсце з сітуацыі — яны часта ўстаўлялі адпаведныя месцы з гэтага твору ў «Іудзейскую вайну». Больш таго, здаралася, што дадавалі і такія звесткі аб Ісусе,

якіх у Іосіфа Флавія наогул няма. У гэтым можна пераканацца, напрыклад, пры аналізе так званага Віленскага спісу.

Творчая спадчына Іосіфа Флавія мае глыбокія карані ў хрысціянскай традыцыі, як заходняй, так і ўсходняй, у тым ліку і ва ўсходнеславянскай.

Творы Іосіфа Флавія карысталіся вялікай павагай у хрысціянскай патрыстыцы. Як на прызнаны аўтарытэт спасылаліся на яго Мінуцый Фелікс, Феафіл, Клімент Александрыйскі, Тэртуліян і інш.[2] Блажэнны Іеронім нават назваў у адным са сваіх лістоў Іосіфа Флавія «Цітам Лівіем грэкаў», зыходзячы, вядома, с грэчаскай мовы яго твораў [3]. У Іероніма Іосіф Флавій трапляе ў пералік знакамітых хрысціянскіх пісьменнікаў у «Кнізе аб знакамітых мужах».

Дзесьці ў гэты час з'явіліся і пераклады твораў Іосіфа Флавія са старажытнагрэчаскай на лацінскую мову. Гэтыя пераклады прыпісваюцца звычайна ці Іероніму ці яго сучасніку Руфіну Аквілейскаму, ці малавядомаму хрысціянскаму аўтару II ст. Гегесіпу [4]. Доўгі час творы Іосіфа Флавія чыталіся ў розных краінах Еўропы на грэчаскай і лацінскай мовах. Потым з'явіліся пераклады на нацыянальныя мовы — у XV ст. на французскую і італьянскую, у XVI — на іспанскую і нямецкую. Дарэчы ўсе яны былі зроблены з лацінскіх перакладаў. У 1540 г. быў надрукаваны і пераклад на ідзіш, але з так званага Іосіпона, а не з самога аўтарскага тэксту [5].

Адным з найбольш ранніх перакладаў «Іудзейскай вайны» Іосіфа Флавія быў яе пераклад на старажытнарускую мову. Усяго старажытнарускі пераклад дайшоў да нас у 30 спісах XV–XVIII ст. З іх толькі два з'яўляюцца амаль поўнымі, і найбольш дасканалы з іх — так званы Віленскі спіс XVI стагоддзя [6]. Ён захоўваецца ў Вільні ў бібліятэцы АН Літвы. Гэта — хранограф, які выкладае сусветную гісторыю ад стварэння свету і да чацвёртага года праўлення рымскага імператара Веспасіяна. У склад гэтай вялікай кампіляцыі (яна мае 736 лістоў) увайшлі кнігі Бібліі, шэраг візантыйскіх хронік, асабліва папулярных Георгія Амартала і Іаана Малалы, «Александрыя», якая распавядала аб Аляксандры Македонскім, і «Іудзейская вайна» Іосіфа Флавія, якая, дарэчы, займае прыкладна 200 з 736 лістоў хранографа. Першым апісаў гэты спіс Ф. Дабранскі ў сваім «Описании рукописей Виленской публичной библиотеки, церковнославянских и русских», выдадзенным у Вільні ў 1882 г. На думку, Ф. Дабранскага, хранограф быў напісаны ў XVII ст. На думку ж

расійскага даследчыка Н.А. Мяшчэрскага, Віленскі хранограф быў створаны не пазней сярэдзіны XVI ст. [7] Сваю даціроўку Н.А. Мяшчэрскі абгрунтаваў філалагічнай аргументацыяй, аналізам вадзяных знакаў паперы і г. д., і, наогул, яго меркаванне здаецца больш слушным. Ён у 1958 г. выдаў тэкст старажытнарускага перакладу «Іудзейскай вайны», у аснову якога якраз і пакладзены Віленскі спіс. Адносна самога перакладу «Іудзейскай вайны» на старажытнарускую мову Н.А. Мяшчэрскі на падставе філалагічнага аналізу прыйшоў да наступных вынікаў — пераклад быў зроблены на Русі невядомым аўтарам не пазней XII ст. [8] Пераклад быў зроблены, несумненна, праваслаўным чалавекам і дзесьці на паўднёвым усходзе Старажытнай Русі. І вельмі важна тое, што пераклад зроблены з грэчаскага арыгінала «Іудзейскай вайны», а не з лацінскага перакладу, і тым больш не з так званага «Іосіпона». «Іосіпон — сярэдневяковая хроніка, складзеная ў IX–X стст. дзесьці ў Італіі ў яўрэйскім асяроддзі (на старажытнаяўрэйскай мове) [9]. Там выкладаюцца падзеі сусветнай гісторыі ад часоў будовы Вавілонскай башні, да ўзяцця рымлянамі Іерусаліма ў 70 г. н. э. У «Іосіпоне» выкарыстаны ў значнай меры змест «Іудзейскай вайны» Іосіфа Флавія і, у некаторай ступені, яго ж «Іудзейскіх старажытнасцей». Аўтарам «Іосіпона» пазначаны Іосіф бэн Гарыён. Чаму не Іосіф Флавій? Па-першае, трэба зазначыць, што ад Іосіфа Флавія там засталося не так і многа, затое было дададзена многа легендарна-казачнага матэрыялу. Па другое, як зазначаюць выдаўцы першага перакладу «Іудзейскіх старажытнасцей» на польскую мову (ён быў выдадзены ў 1962 годзе), у той час яўрэі адносіліся даволі насцярожана да Іосіфа Флавія, які аказаўся здраднікам пад час вайны з рымлянамі, і яго імя было заменена на іншае [10].

«Іосіпон» у адрозненне ад арыгінальнай «Іудзейскай вайны» быў намнога больш недакладны ў гістарычным плане, але карыстаўся вялікай папулярнасцю ў сярэднія вякі, і не толькі сярод яўрэяў. Ён даволі рана быў перакладзены і на старажытнарускую мову. Сярод даследчыкаў існуюць думкі, што гэта адбылося ў XIII, а магчыма і ў XI ст. [11]

У Старажытнай Русі, такім чынам, існавалі і чыталіся як пераклад «Іудзейскай вайны» Іосіфа Флавія, зроблены з грэчаскага тэксту, так і перапрацоўка яго твораў у выглядзе «Іосіпона», перакладзеная відаць з яўрэйскай мовы.

Трэба зазначыць, што старажытнарускі пераклад «Іудзейскай вайны» не зусім поўны. Калі паглядзець па зместу Віленскага спісу, то мы не знойдзем некаторых цікавых месц: напрыклад унікальныя апісанні Іосіфам умацаванняў Іерусаліма, Іерусалімскага храма, вопраткі першасвяшчэннікаў і інш. З іншага боку, у старажытнарускім перакладзе з'явіліся і «дапаўненні», якіх няма ў тэксце арыгінала.

Творы Іосіфа Флавія мелі сур'ёзны ўплыў на старажытнарускую літаратуру. Яшчэ ў мінулым стагоддзі, у 1876 г., у сваім артыкуле «Критический очерк литературы» «Слова о полку Игореве» расійскі даследчык Е.В. Барсаў заўважыў дзіўнае падабенства мноства выразаў, вобразаў паміж «Словам аб палку Ігаравым» і старажытнарускім перакладам «Іудзейскай вайны» Іосіфа Флавія, асабліва ў апісаннях баявых дзеянняў, воінскіх звычаях, гераізму. Праўда, Е.В. Барсаў спачатку не адважыўся гаварыць аб уплыве «Іудзейскай вайны» на «Слова», зазначыўшы, што ўплыў мог быць і адваротным. Але праз 11 гадоў ён пачаў рашуча адстойваць і абгрунтоўваць канцэпцыю аб уплыве менавіта «Іудзейскай вайны» на «Слова аб палку Ігаравым» [12]. Зараз даследчыкі гавораць аб стылевых запазычаннях з «Іудзейскай вайны» у Галіцка-Валынскім летапісу, «Слове аб пагібелі зямлі Рускай», «Паломніку» Данілы-ігумена і ў «Жыцці Аляксандра Неўскага»[13].

Цікава, што даследчыкамі зафіксавана і выкарыстанне ўрыўкаў з «Іосіпона» у тэксце некаторых рэдакцый «Аповесці мінулых гадоў».

Значная частка «Іосіпона» увайшла ў «Элінскі і рымскі летапісец» другой рэдакцыі пачатку XIII ст., а гэта быў на той час, бадай што, галоўны твор для азнаямлення са старажытнай гісторыяй на Русі.

Многа цытаваў «Іудзейскую вайну» Іосіфа Флавія вядомы расійскі царкоўны дзеяч Іосіф Валоцкі, дарэчы, выкарыстоўваючы гэты матэрыял, каб даказаць сваю слушнасць у спрэчках, якія разгарнуліся ў праваслаўнай царкве. Увайшла «Іудзейская вайна» і ў «Вялікія Чэцці-Мінеі».

Жыхары сярэдневяковай Беларусі маглі знаёміцца з творамі Іосіфа Флавія як па рукапісных спісах старажытнарускага перакладу «Іудзейскай вайны», так і па іх пераробцы ў «Іосіпоне». З пачаткам кнігадрукавання з'явілася магчымасць карыстацца друкаваным «Іосіпонам» на польскай мове. Першы пераклад яго на польскую мову, выкананы Ленартам з Ужды́дова, быў надрукаваны ў Вільні ў 1595 г. Другое выданне гэтага перакладу з папраўкамі Яна Казакевіча было здзейснена ў Любчы ў 1617 г.[14]

Дарэчы менавіта з польскага перакладу «Іосіпона» быў зроблены папулярны ў Расіі яго пераклад на царкоўнаславянскую мову. Але строга гаворачы, мова гэтага расійскага перакладу мае мноства выразаў са старабеларускай мовы, і таму, ёсць падставы меркаваць, што ён быў зроблены беларусам, а, магчыма, і на тэрыторыі Беларусі.

---

[1] Ревяко К.А., Федосик В.А. Предисловие // Иосиф Флавий. Иудейская вайна. Мн., 1991. С. 4–6; Balaban M. Josephus Flawiusz. Charakterystuka człowieka i historyka na tle współczesnych wypadków. Lwow, 1904. S. 7–14.

[2] Theophil., Ad Autolic., III, 22; Clim. Alex., Strom., I, 147; Tertullian., Apolog., 19; Min. Felix, Octav., 36.

[3] Epist. ad Eustach., 1.

[4] Иосиф Флавий // Православное обозрение. Т. 6. М.,1861. С. 52; Balaban M.Josephus Flawiusz .S. 30.

[5] Иосиф Флавий // Православное обозрение. С. 53; Przedmowa // Josephus Flawiusz. Dawne dzieje Izraela. Poznań, 1962. S. 5.

[6] Мещерский Н.А. История Иудейской войны Иосифа Флавия в древнерусском переводе. М.-Л.,1958. С.15.

[7] Там же. С. 22–28.

[8] Там же. С. 22–28.

[9] Успенский А. Иосиф Флавий и его отношение к Библии // Православный собеседник. Ноябрь 1900. С.16; Przedmowa // Josephus Flawiusz. Dawne dzieje Izraela. S. 5.

[10] Przedmowa // Josephus Flawiusz. Dawne dzieje Izraela. S. 5.

[11] Мещерский Н.А. История Иудейской войны Иосифа Флавия в древнерусском переводе. С. 142.

[12] Барсов Е.В. Критический очерк литературы «Слова о полку Игореве» // ЖМНП, 1876. Т. 10. С. 63; Барсов Е.В. «Слово о полку Игореве» как художественный памятник Киевской «дружинной Руси». Т. 1. М., 1887. С. 213–259.

[13] Мещерский Н.А. История Иудейской войны Иосифа Флавия в древнерусском переводе. С. 143–156.

[14] Przedmowa // Josephus Flawiusz. Dawne dzieje Izraela. S. 73.